View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

**Сцепановіч, Я. М.** Фітацэнаразнастайнасць раслліннасці Беларусі // Ботаника: Исследования. Вып. XXXIV. – Мн.: ИООО «Право и экономика», 2006. – С. 264–281.

*УДК 581.552(476)*

Я. М. СЦЕПАНОВІЧ

# ФІТАЦЭНАРАЗНАСТАЙНАСЦЬ РАСЛІННАСЦІ БЕЛАРУСІ

**Уводзіны.** Праблема ацэнкі й захавання біялагічнай разнастайнасці ўзнікла яшчэ ў канцы 19 ст. і зараз набыла планетарны маштаб. Сведчанне таму – адмысловая канферэнцыя Арганізацыі Аб'яднаных Нацый у Рыо-дэ-Жанейро (5 чэрвеня 1992 г.) і падпісанне "Канвенцыі аб біялагічнай разнастайнасці". У Канвенцыі адлюстравана ўсведамленне вечнай каштоўнасці біяразнастайнасці, яе значэнне для эвалюцыі й захавання сістэмаў біясферы, якія падтрымліваюць жыццё, і падкрэслена, што захаванне біяразнастайнасці – агульная задача ўсяго чалавецтва [1].

Згодна з прынятай Канвенцыяй пад біялагічнай разнастайнасцю разумеецца "варыяцыйнасць жывых арганізмаў з усіх крыніцаў, уключаючы, між іншым, наземныя, марскія й іншыя водныя экасістэмы й экалагічныя комплексы, часткай якіх яны з'яўляюцца; гэта паняцце ўключае ў сябе разнастайнасць у рамках віда, паміж відамі й разнастайнасць экасістэмаў" [1: с. 5]. Такім чынам, паняцце "біяразнастайнасць" распаўсюджваецца ня толькі на віды й папуляцыі, але перад усім на супольніцтвы (біяцэнозы) і экатопы, ад якіх арганізмы й папуляцыі відаў цалкам залежныя.

Вядома, што йснаванне выключна ўсіх відаў, папуляцый і супольніцтваў магчыма толькі ў пэўных умовах асяроддзя. Таму захоўваць трэба комплексныя прыродныя ўтварэнні – супольніцтвы разам з экатопам, дзе яны фармуюцца, або экасістэмы, што й прадпрымаецца навукоўцамі-прыродаахоўнікамі пры вылучэнні, у прыватнасці, важных для птушак [2] і ключавых батанічных тэрыторый Беларусі [3]. Аднак калі сістэма арганізмаў на відавым узроўні ды ў сусветным маштабе даволі дасканала распрацавана, то сістэматызацыя супольніцтваў базуецца на розных метадычных падыходах, не ўніфікавана, а экалагічных комплексаў (экасістэмаў) навогул ня мае агульнай платформы спарадкавання, ня вызначана іх асноўная таксанамічная катэгорыя. У сістэматыцы расліннасці (сінтаксанаміі) найбольш шырокае ўжыванне атрымала эколага-фларыстычная класіфікацыя Й. Браўн-Бланке. На яе аснове Дж. С. Радвэллем і іншымі фітацэнолагамі складзена сінтаксанамічная зводка, дзе адлюстравана сучасная разнастайнасць расліннасці й экасістэмаў Еўропы [4].

На Беларусі, на жаль, няма цэласнай сістэмы як біяцэнозаў (супольніцтваў), так і экасістэмаў у цэлым, за выключэннем сінтаксанаміі прыродных катэгорый травяністай расліннасці [5], што сур'ёзна ўскладняе ацэнку, ахову й устойлівае выкарыстанне біяразнастайнасці ня толькі расліннага свету. Яе адсутнасць не спрыяе й міжнароднаму супрацоўніцтву краіны ў прыродаахоўнай справе. Адсюль вынікае неабходнасць распрацоўкі ўніфікаванай сістэмы раслінных супольніцтваў і экатопаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Аб’екты й метады даследаванняў.** Аб’ектам даследавання з’яўлялася расліннае покрыва, якое займае 20194,0 тыс. га, або 97,3% тэрыторыі Беларусі (**табліца 1**). Прыродныя раслінныя супольніцтвы сукупна ахопліваюць 13506,1 тыс. га, або 65,1% тэрыторыі й пададзены лясамі (8335,1 тыс. га, або 41,3%), лугамі (3289,7 тыс. га, або 16,3%), балотамі (916,2 тыс. га, або 4,5%), хмызнякамі (486,6 тыс. га, або 2,4%) і воднымі цэнозамі (478,5 тыс. га, або 2,4%). Амаль трэцюю частку пакрытай раслiннасцю тэрыторыі (32,2%) займаюць сінантропныя (сегетальныя й бальшыня рудэральных) супольніцтвы, якія існуюць дзякуючы гаспадарчай дзейнасці чалавека. Сярод гэтай катэгорыі раслiннасці значна пераважаюць супольніцтвы ворыўных земляў (палёў і агародаў) – займаюць 5547,9 тыс. га, або 27,5%. Таксама прыкметную плошчу (665,2 тыс. га, або 3,3%) ахоплівае расліннасць аблогаў і закінутых земляў. У значна меншай ступені пашыраны прыдарожныя супольніцтвы, а таксама расліннасць садоў і ягаднікаў і інш. (гл. табл. 1).

З улікам папярэдніх напрацовак [5–7] і аналізу сабраных аўтарам новых геабатанічных звестак (сукупна больш за 5 тыс. апісанняў) прадпрынята спроба распрацоўкі прадромусу вышэйшых адзінак усіх названых катэгорый расліннасці Беларусі: лясной, лугавой, балотнай, хмызняковай, вадаёмаў, сегетальнай (пустазельна-палявой) і рудэральнай (сметнікавай). Пры гэтым выкарыстаны такі інтэгральны паказнік фітасупольніцтваў як эдыфікатарныя дамінанты [8]. Рэпрэзэнтацыйнасць геабатанічных апісанняў дасягалася метадам эколага-фітацэнатычных профіляў, або трансэктаў, які дазваляе ўлічваць усю фітацэнатычную разнастайнасць вывучальнай тэрыторыі [9].

Пералік вышэйшых адзінак расліннасці (ад класа да асацыяцыі) складзены ў кантэксце міжнароднай сістэмы сінтаксонаў (EUNIS Habitat Classification) [4]. Ён пададзены ў выглядзе прадромуса (**табліца 2**).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Табліца 1. Размеркаванне земляў, занятых расліннасцю, па стане на 1.01.2005 г. (у тыс. га)**

| Па Мінску й вобласцях | Агульная плошча земляў | З іх пакрытых расліннасцю | У тым ліку: | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | ворыўных | аблогавых і невыкарыстальных | пад садамі й ягаднікамі | лугавых | лясных | пад хмызнякамі | пад балотамі | пад вадой | пад дарогамі, вуліцамі дварамі | іншых |
| *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *11* | *12* | *13* |
| г. Мінск | 28,1<br>*0,1* | 14,2<br>*50,5* | 0,9<br>*6,3* | 1,1<br>*7,8* | 0,5<br>*3,5* | 0,1<br>*0,7* | 2,8<br>*19,7* | 1,1<br>*7,8* | 0,0<br>*0,0* | 0,7<br>*4,9* | 6,9<br>*48,6* | 0,1<br>*0,7* |
| Брэсцкая | 3279,1<br>*15,8* | 3183,0<br>*97,1* | 811,3<br>*25,5* | 109,4<br>*3,4* | 20,5<br>*0,7* | 581,1<br>*18,3* | 1180,7<br>*37,1* | 53,5<br>*1,7* | 277,2<br>*8,7* | 83,5<br>*2,6* | 48,3<br>*1,5* | 17,0<br>*0,5* |
| Віцебская | 4004,9<br>*19,3* | 3918,0<br>*97,8* | 921,9<br>*23,5* | 67,4<br>*1,7* | 17,5<br>*0,5* | 659,8<br>*16,8* | 1630,2<br>*41,6* | 205,9<br>*5,3* | 217,8<br>*5,6* | 145,2<br>*3,7* | 43,5<br>*1,1* | 8,7<br>*0,2* |
| Гомельская | 4036,3<br>*19,5* | 3935,0<br>*97,5* | 804,5<br>*20,4* | 207,2<br>*5,3* | 20,0<br>*0,5* | 564,7<br>*14,3* | 1960,4<br>*49,8* | 61,7<br>*1,6* | 171,9<br>*4,4* | 81,8<br>*2,1* | 50,5<br>*1,3* | 12,6<br>*0,3* |
| Гродзенская | 2511,8<br>*12,1* | 2441,0<br>*97,2* | 838,9<br>*34,4* | 92,4<br>*3,8* | 16,4<br>*0,7* | 411,5<br>*16,9* | 884,1<br>*36,2* | 36,1<br>*1,5* | 80,3<br>*3,3* | 35,3<br>*1,4* | 35,4<br>*1,4* | 10,7<br>*0,4* |
| Мінская | 3991,6<br>*19,2* | 3869,0<br>*96,9* | 1291,6<br>*33,4* | 85,4<br>*2,2* | 29,8<br>*0,8* | 567,1<br>*14,6* | 1562,6<br>*40,4* | 81,2<br>*2,1* | 77,5<br>*2,0* | 95,0<br>*2,5* | 61,5<br>*1,6* | 17,0<br>*0,4* |
| Магілёўская | 2908,0<br>*14,0* | 2834,0<br>*97,5* | 878,8<br>*31,0* | 102,3<br>*3,6* | 14,5<br>*0,5* | 505,4<br>*17,9* | 1114,3<br>*39,3* | 47,1<br>*1,7* | 91,5<br>*3,2* | 37,0<br>1,3 | 36,9<br>*1,3* | 6,3<br>*0,2* |
| **Усяго па краіне** | **20759,8**<br>***100,0*** | **20194,0**<br>***97,3*** | **5547,9**<br>***27,5*** | **665,2**<br>***3,3*** | **119,2**<br>***0,6*** | **3289,7**<br>***16,3*** | **8335,1**<br>***41,3*** | **486,6**<br>***2,4*** | **916,2**<br>***4,5*** | **478,5**<br>***2,4*** | **283,0**<br>***1,4*** | **72,4**<br>***0,3*** |

Заўвага: у лічніку ўказана плошча, у назоўніку (*курсівам*) – працэнт ад агульнай плошчы земляў (графа 3) і агульнай плошчы пакрытых расліннасцю земляў (графы 4–13).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Табліца 2. Прадромус вышэйшых адзінак расліннасці Беларусі**

| Код | Супольніцтва |
|---|---|
| 08 | **Клас 1. Festuco-Puccinellietea Soó 1968 em. Vicherek 1973 – травяныя супольніцтвы на багатых працягла заліўных алювіяльных глебах** |
| 08G | Ворда 1. Scorzonero-Juncetalia gerardii Vicherek 1973 |
| 08G02 | Уніён 1. Beckmannion eruciformis Soó ap. Mathe 1933 |
| | Асацыяцыя 1. Alopecuretum geniculati R. Tx. 1937 em. Stepanovič 2000 – каленчатабатлачыкавая |
| | Ас. 2. Agrostidetum stoloniferae Moor 1958 ex Müller et Oberdorfer in Müller 1961 em. Stepanovič 2000 – парасткаўтваральнамятліцавая |
| | Ас. 3. Juncetum atrati Vilcherek in Balátová-Tuláčková 1969 em. Stepanovič 2000 – чорнасітовая |
| | Ас. 4. Beckmannietum eruciformis R. Jovanovič 1958 – бекманніевая |
| | Ас. 5. Eleocharidetum uniglumis Stepanovič 2000 – адналускавабалотніцавая |
| 11 | **Клас 2. Honkenyo-Elymetea arenarii R. Tx. 1966 – прыбярэжныя атлантычныя травяныя супольніцтвы***|
| 11B | Ворда 1. Honkenyo-Elymetalia arenarii R. Tx. 1966 |
| 11B03 | Уніён 1. Honkenyo-Elymion arenarii R. Tx. 1966 em. Géhu et R. Tx. in Géhu 1975 |
| | Ас. 1. Elymetum arenarii Steffen 1931 – пясчанакаласняковая |
| 17 | **Клас 3. Lemnetea (minoris) de Bolòs et Masclans 1955 em. R. Tx. 1955 – супольніцтвы плавальных раслін***|
| 17A | Ворда 1. Lemnetalia minoris Bolòs et Masclans 1955 em. R. Tx. 1955 |
| 17A01 | Уніён 1. Lemnion minoris (Koch 1954) Bolòs et Masclans 1955 em. R. Tx. 1955 |
| | Ас. 1. Lemnetum minoris (Oberdorfer 1957) Müller et Görs 1960 – малараскавая |
| | Ас. 2. Lemnetum gibbae (Koch 1954) Mijawaki et J. Tx. 1960 – гарбатараскавая |
| 17A02 | Уніён 2. Lemnion trisulcae Den Hartog et Segal ex R. Tx. et Schwabe in R. Tx. 1974 |
| | Ас. 1. Lemnetum trisulcae (Soó 1927) Knapp et Staffers 1962 – трохдольчатараскавая |
| | Ас. 2. Riccietum fluitantis Slavnić 1956 – воднарычччыевая |
| 17A03 | Уніён 3. Lemno minoris-Hydroharition morsus-ranae (Passarge 1978) Rivas-Martínez, Fernández-González & Loidi 1999 (Hydroharition Rübel 1933 em. Soó 1951) |
| | Ас. 1. Stratiotetum aloidis (Rübel 1920) Nowiński 1930 em. Miljan 1933 – целарэзавая |
| | Ас. 2. Hydrocharitetum morsus-ranae Van Langendonck 1935 – жабнікавая |
| 19 | **Клас 4. Potametea Klika in Klika et Novák 1941 em. R. Tx. et Preising 1942 – супольніцтвы прэснаводных вадаёмаў***|
| 19B | Ворда 1. Potametalia (eurosibiricum) Koch 1926 em. Br.-Bl. et R. Tx. 1944 |
| 19B01 | Уніён 1. Ceratophyllion demersi Den Hartog et Segal ex Passarge 1996 |
| | Ас. 1. Ceratophylletum demersi (Soó 1927) Eggler 1933 em. Hild 1956 – апушчанарагалісніковая |
| 19B03 | Уніён 2. Nymphaeion albae (Koch 1926) Oberdorfer 1957 |
| | Ас. 1. Potametum natantis Soó 1927 em. Oberdorfer 1977 – плавальнардэставая |
| | Ас. 2. Nupharetum luteae Koch 1926 – жоўтагарлачыкавая |
| | Ас. 3. Nupharetum pumili Oberdorfer 1957 – малагарлачыкавая |
| | Ас. 4. Nymphoidetum peltatae (Allorge 1922) Oberdorfer et Müller 1960 – балотнакветнікавая |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| | Ас. 5. Trapetum natantis Müller et Görs 1960 – рагульнікавая |
| | Ас. 6. Nymphaeetum candidae (Hejný 1948) Mijan 1958 – чыстабелагарлачыкавая |
| | Ас. 7. Nymphaeetum albae Vollmar 1947 – белагарлачыкавая |
| 19B04 | Уніён 3. Parvopotamion (Vollmar 1947) Den Hartog et Segal 1964 |
| | Ас. 1. Potamogetonetum pectinati Carstensen 1955 – грабенчатардэставая |
| | Ас. 2. Potamogetonetum filiformis Koch 1926 – ніткаватардэставая |
| | Ас. 3. Potamogetonetum lucentis Hueck 1931 – бліскучардэставая |
| | Ас. 4. Potamogetonetum compressi Tomaszewicz 1979 – сплюшчанардэставая |
| | Ас. 5. Potamogetonetum perfoliati Koch 1926 em. Passarge 1964 – праніцаналістардэставая |
| | Ас. 6. Potametum crispi Soó 1927 em. Klika et Hadač 1944 – кучаравардэставая |
| | Ас. 7. Elodeetum canadensis Eggler 1933 – эладэевая |
| 19B05 | Уніён 4. Magnopotamion Vollmar 1947 |
| | Ас. 1. Najadetum marinae (Oberdorfer 1957) Fukarek 1961 – морсканаядавая |
| 19B06 | Уніён 5. Utricularion vulgaris Passarge 1964 |
| | Ас. 1. Utricularietum vulgaris Soó (1928) 1938 – звычайнаплывунцовая |
| 20 | **Клас 5. Montio-Cardaminetea Br.-Bl. et R. Tx. 1943 – крынічныя супольніцтвы*** |
| 20B | Ворда 1. Montio-Cardaminetalia Pawłowski in Pawł., Sokoł., Wallisch 1928 |
| 20B02 | Уніён 1. Cardamino-Montion Br.-Bl. 1926 |
| | Ас. 1. Cardaminetum amarae Br.-Bl. 1926 – горкабуймінавая |
| | Ас. 2. Petasitetum hybridi Klika 1955 – гібрыднабелакапытнікавая |
| | Ас. 3. Tussilagetum farfarae Oberdorfer 1949 – падбелавая |
| 21 | **Клас 6. Isoëto-Littorelletea Br.-Bl. et Vlieger 1937 – супольніцтвы водмеляў*** |
| 21A | Ворда 1. Littorelletalia (uniflorae) Koch 1926 |
| 21A02 | Уніён 1. Eleocharition acicularis Pietsch 1966 em. Dierssen 1975 |
| | Ас. 1. Eleocharitetum acicularis (Baumann 1911) Koch 1926 – іголчатабалотніцавая |
| 21A06 | Уніён 2. Potamion graminei (Den Hartog & Segal 1964) Westhoff & Den Held 1969 |
| | Ас. 1. Hottonietum palustris R. Tx. 1937 – вадаперыцавая |
| | Ас. 2. Potamogetonetum graminei (Koch 1926) Passarge 1964 em. Görs 1977 – злакавардэставая |
| 21B | Ворда 2. Utricularietalia intermedio-minoris Pietsch 1965 |
| 21B01 | Уніён 1. Scorpidio-Utricularion minoris Pietsch 1965 |
| | Ас. 1. Sparganietum minimi Schaaf 1925 – малаплюшчаевая |
| 23 | **Клас 7. Phragmito-Magnocaricetea Klika (1942) 1944 – балоцістыя травяныя супольніцтвы** |
| 23A | Ворда 1. Nasturtio-Glycerietalia Pignatti 1953 em. Kopecký 1965 |
| 23A01 | Уніён 1. Glycerio-Sparganion Br.-Bl. et Sissingh 1942 ap. Boer 1942 |
| | Ас. 1. Sparganietum erecti Roll 1938 – прамаплюшчаевая |
| | Ас. 2. Glycerietum fluitantis Wilzek 1935 em. Grynia et Cholava 1968 – наплыўнаманнікавая |
| 23A02 | Уніён 2. Phalaridion arundinaceae Kopecký (1960) 1961 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| | Ас. 1. Scirpetum silvatici Eggler 1933 em. Knapp 1946 – лесачаротавая |
| | Ас. 2. Phalaridetum arundinaceae Koch 1926 em. Libbert (1931) 1932 – трысняговачаротніцавая |
| | Ас. 3. Caricetum vulpinae Nowiński 1927 em. Soó 1927 – лісінаасаковая |
| 23B | Ворда 2. Phragmitetalia (communis) Koch 1926 em. Pignatti 1953 |
| 23B04 | Уніён 1. Magnocaricion elatae Koch 1926 |
| | Ас. 1. Caricetum ripariae Soó 1928 – берагаваасаковая |
| | Ас. 2. Caricetum acutiformis (Sauer 1937) R. Tx. 1937 em. Soó 1938 – завостранаасаковая |
| | Ас. 3. Caricetum paniculatae Wangerin 1916 em. Von Rochow 1951 – мецёлчатаасаковая |
| | Ас. 4. Caricetum rostratae Rϋbel 1912 em. Balátová-Tuláčková 1963 – успухлаасаковая |
| | Ас. 5. Caricetum elatae Koch 1926 – высокаасаковая |
| | Ас. 6. Caricetum omskianae Korolyuk 1993 em. Stepanovič 2000 – омскаасаковая |
| | Асс. 7. Caricetum appropinquatae Koch 1926 em. Soó 1938 – збліжанаасаковая |
| | Асс. 8. Caricetum distichae (Nowiński 1928) Jonas 1933 em. Kopecký 1960 – двухрадковаасаковая |
| | Асс. 9. Scirpetum radicantis Hejný in Dykyjová et Kvet 1978 – укараняльначаротавая |
| | Ас. 10. Caricetum gracilis (Allorge 1922) Soó 1927 em. R. Tx. 1937 – стройнаасаковая |
| | Ас. 11. Caricetum vesicariae Br.-Bl. et Denis 1928 – пухірчатаасаковая |
| | Ас. 12. Caricetum aquatilis Nordh. 1928 em. Dierβen 1982 – воднаасаковая |
| 23B06 | Уніён 3. Phragmition communis Koch 1926 |
| | Ас. 1. Scirpetum lacustris (Allorge 1922) Chauard 1924 em. Schmale 1939 – азёрначаротавая |
| | Ас. 2. Typhetum angustifoliae (Allorge 1922) Soó 1927 em. Pignatti 1953 – вузкалістапухоўкавая |
| | Ас. 3. Sagittario-Sparganietum emersi R. Tx. 1953 – стрэлкалістава-плавальнаплюшчаевая |
| | Ас. 4. Eleocharidetum palustris (Šennikov 1919) Ubrizsy 1948 – балотнабалотніцавая |
| | Ас. 5. Equisetetum limosi Steffen 1931 em. Wilczek 1935 em. Matuszkiewicz 1984 – багнавахвашчовая |
| | Ас. 6. Phragmitetum communis (Koch 1926) Gams 1927 em. Schmale 1939 – трысняговая |
| | Ас. 7. Typhetum latifoliae Soó 1927 em. G. Lang 1973 – шыракалістапухоўкавая |
| | Ас. 8. Acoretum calami (Domin 1923) Eggler em. Schulz 1941 – аеравая |
| | Ас. 9. Glycerietum aquaticae Hueck 1931 – воднаманнікавая |
| 24 | **Клас 8. Scheuchzerio-Caricetea fuscae Nordh. 1936 em. Br.-Bl. et Tx. 1943 – ацыдафільныя супольніцтвы травяных балот** |
| 24B | Ворда 1. Caricetalia fuscae Koch 1926 em. Nordhagen 1936 em. Br.-Bl. 1949 |
| 24B03 | Уніён 1. Caricion fuscae Koch 1926 em. Klika 1934 |
| | Ас. 1. Equisetetum palustri Stepanovič 2000 – балотнахвашчовая |
| | Ас. 2. Juncetum filiformis R. Tx. 1937 – ніткаватасітовая |
| | Ас. 3. Caricetum fuscae Br.-Bl. 1915 em. Koch 1926 – чорнаасаковая |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| | Ас. 4. Agrostidetum caninae (R. Tx. 1937) Stepanovič 2000 – сабачамятліцавая |
| | Ас. 5. Caricetum canescentis Dohnal et al. 1965 – шэраватаасаковая |
| | Ас. 6. Eriophoretum polystachii (Domin 1923) Otruba (1945) 1947 – шматкаласковападвеевая |
| | Ас. 7. Caricetum juncellae Mirkin et al. 1992 – сітковаасаковая |
| 24C | Ворда 2. Scheuchzerietalia palustris Nordhagen 1936 |
| 24C01 | Уніён 1. Caricion lasiocarpae Van den Bergh. in Lebrun et al. 1949 |
| | Ас. 1. Caricetum diandrae Jonas (1932) 1933 em. Oberdorfer 1957 – двухтычынкаваасаковая |
| | Ас. 2. Calamagrostidetum neglectae Toppa 1956 – непрыкметнапажарніцавая |
| | Ас. 3. Caricetum lasiocarpae (Osvald 1923) Koch 1926 em. Klika 1935 – валосістаплоднаасаковая |
| 24C02 | Уніён 2. Rhynchosporion albae Koch 1926 |
| | Ас. 1. Caricetum limosae (Paul 1910) Br.-Bl. 1921 em. Klika 1935 – багнаваасаковая |
| | Ас. 2. Caricetum chordorrhizae Paul et Lutz 1941 – бізунаватаасаковая |
| 25 | **Клас 9. Oxycocco-Sphagnetea (magellanici) Br.-Bl. et R. Tx. 1943 – супольніцтвы вярховых і пераходных балот** |
| 25A | Ворда 1. Erico-Ledetalia palustris (Nordh. 1936) R. Tx. 1937* |
| 25A03 | Уніён 1. Oxycocco-Ericion tetralicis (Nordh. 1936) R. Tx. 1937 em. Moore 1968 |
| | Ас. 1. Empetro-Sphagnetum fusci Du Rietz 1921 em. Dierβen 1980 – вадзяніцава-сфагнавая |
| | Ас. 2. Oxycocco-Callunetum Schubert 1960 – журавінава-верасовая |
| 25B | Ворда 2. Sphagnetalia medii Kästner et Flössner 1933 |
| 25B01 | Уніён 1. Eriophorion vaginati Krajina 1933 (Sphagnion magellanici Kästner et Flössner 1933 em. Dierss. 1975) |
| | Ас. 1. Eriophoretum vaginati (Hueck 1925) Stepanovič 2000 – пахвенавападвеевая |
| 25B02 | Уніён 2. Sphagnion medii Kästner et Flössner 1933 |
| | Ас. 1. Sphagnetum magellanici Kästner et Flössner 1933 – магелланска-сфагнавая |
| 25C | Ворда 3. Sphagno-Betuletalia pubescentis Lohmeyer et R. Tx. in Scamoni et Passarge 1959* |
| 25C01 | Уніён 1. Betulion pubescentis Lohmeyer et R. Tx. 1955 |
| | Ас. 1. Betuletum pubescentis R. Tx. (1937) 1955 – пушыстабярозавая |
| | Ас. 2. Pino-Ledetum palustris R. Tx. 1955 – хваёва-багуновая |
| 26 | **Клас 10. Molinio-Arrhenatheretea R. Tx. 1937 – супольніцтвы сапраўдных (эўмезафільных) і сырых лугоў** |
| 26B | Ворда 1. Arrhenatheretalia (elatioris) Pawłowski (1926) 1928 |
| 26B01 | Уніён 1. Arrhenatherion elatioris (Br.-Bl. 1925) Koch 1926 |
| | Ас. 1. Arrhenatheretum elatioris (Br.-Bl. 1915) Scherrer 1925 – высокарайграсавая |
| | Ас. 2. Festucetum rubrae (Domin 1923) Válek 1956 em. Pukau et al. 1956 – чырвонамурожніцавая |
| | Ас. 3. Brometum mollis (de Foucault 1989) Stepanovič 2000 – мяккабромусавая |
| | Ас. 4. Helictotrichonetum pubescentis (de Leeuw 1936) Stepanovič 1999 – пушыстааўсяцовая |
| | Ас. 5. Brizetum mediae Stepanovič 2000 – дрыжнікавая |
| 26B02 | Уніён 2. Cynosurion cristati Br.-Bl. et R. Tx. 1943 em. R. Tx. 1947 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| | Ас. 1. Cynosuretum cristati (R. Tx. 1937) R. Tx. ap Bukker 1942 – грэбнікавая |
| | Ас. 2. Trifolietum repentis Shvergunova et al. 1984 – паўзучаканюшынавая |
| | Ас. 3. Lolietum perenni (Domin 1930) Stepanovič 2000 – шматгадоважыцікавая |
| | Ас. 4. Dactylidetum glomeratae Jenik et al. 1980 em. Stepanovič (1987) 2000 – купкоўкавая |
| | Ас. 5. Phleetum pratensi Stepanovič 2000 – лугавацімафееўкавая |
| | Ас. 6. Trifolietum pratensi Stepanovič 2000 – лугаваканюшынавая |
| | Ас. 7. Poetum pratensis Stepanovič 2000 – лугаваметлюжковая |
| | Ас. 8. Festucetum pratensis Soó 1938 – лугавамурожніцавая |
| 26D | Ворда 2. Galietalia veri Mirkin et Naumova 1986 |
| 26D04 | Уніён 1. Trifolion montani (Preising 1949) |
| | Ас. 1. Poetum angustifoliae (Domin 1943) Schelyag-Sosonko et al. 1986 – вузкалістаметлюжковая |
| | Ас. 2. Trifolietum montani Mirkin et al. 1983 em. Shvergunova et al. 1984 – горнаканюшынавая |
| | Ас. 3. Galietum veri Shvergunova et al. 1984 – сапраўднамарунавая |
| 26E | Ворда 3. Holoschoenetalia Br.-Bl. (1931) 1947 |
| 26E05 | Уніён 1. Sieglingion decumbentis Gamisans 1976 |
| | Ас. 1. Sieglingietum decumbentis Stepanovič (1987) 1991 – зіглінгіевая |
| | Ас. 2. Anthoxanthetum odorati Kmoniček 1934 – духмянакаласковая |
| 26F | Ворда 4. Molinietalia (coeruleae) Koch 1926 |
| 26F01 | Уніён 1. Alopecurion pratensis Passarge 1964 |
| | Ас. 1. Alopecuretum pratensis (Regel 1925) Steffen 1931 – лугавабатлачыкавая |
| | Ас. 2. Poetum trivialis (Soó 1938) Stepanovič 2000 – звычайнаметлюжковая |
| | Ас. 3. Poetum palustris Resmerita et Ratiu 1974 – балотнаметлюжковая |
| | Ас. 4. Agrostidetum albae (Savič 1926) Michalko et Petráňová 1967 – беламятліцавая |
| 26F05 | Уніён 2. Deschampsion caespitosae Horvatić 1930 |
| | Ас. 1. Festucetum arundinaceae (Jílek et Velísek 1963) Stepanovič 2000 – трысняговамурожніцавая |
| | Ас. 2. Deschampsietum caespitosae (Klika 1925) Horvatić 1930 – дзірваніставострыцавая |
| | Ас. 3. Juncetum effusi (Pauca 1941) Soó 1947 – разгалістасітовая |
| | Ас. 4. Juncetum conglomerati (Válek 1962) Stepanovič 2000 – скучанасітовая |
| 26F06 | Уніён 3. Filipendulion ulmariae (Br.-Bl. 1947) Lohm. ap. Oberd. et al. 1967 em. Balátová-Tuláčková 1978 |
| | Ас. 1. Filipenduletum ulmariae Shvergunova et al. 1984 – вязаліставятроўнікавая |
| | Ас. 2. Polygonetum bistortae (Tx. 1951) Stepanovič 2000 – змяінадрасёнавая |
| | Ас. 3. Caricetum caespitosae (Steffen 1931) Klika et Šmarda 1941 em. Palczewski 1975 – дзірваністаасаковая |
| | Ас. 4. Calamagrostidetum canescentis Březina et al. 1963 em. Peciar 1967 – шэраватапажарніцавая |
| 26F10 | Уніён 4. Molinion (coeruleae) Koch 1926 |
| | Ас. 1. Molinietum coeruleae Koch 1926 – маліниевая |
| | Ас. 2. Caricetum echinatae Stepanovič (1987) 2000 – вожыкавакалючаасаковая |

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

| | |
|---|---|
| | Ас. 3. Caricetum paniceae Šmarda 1951 – прасянаасаковая |
| | Ас. 4. Caricetum flavae (Novacký 1946) Šmarda 1950 – жоўтаасаковая |
| 28 | **Клас 11. Festuco-Brometea (erecti) Br.-Bl. et R. Tx. 1943 – астэпаваныя (ксератэрмныя) лугавыя супольніцтвы** |
| 28C | Ворда 1.Brometalia erecti Br.-Bl. 1936 |
| 28C02 | Унiён 1. Bromion erecti Br.-Bl. et Moor 1938 |
| | Ас. 1. Caricetum praecocis (R. Tx. ex Walther 1977) Stepanovič 2000 – раннеасаковая |
| | Ас. 2. Bromopsidetum inermis (Podpěra 1928) Shvergunova et al. 1984 – безасцюковакаласняцовая |
| 28I | Ворда 2. Koelerio-Phleetalia phleoidis Korneck 1974 |
| 28I02 | Унiён 1. Koelerio-Phleion phleoidis (Domin 1928) Korneck 1974 |
| | Ас. 1. Phleetum phleoidis Podpěra 1928 – стэпавацімафееўкавая |
| | Ас. 2. Festucetum polesicae (Regel 1928) Stepanovič 2000 – палескамурожніцавая |
| 28J | Ворда 3. Poo-Agrostietalia vinealis Shelyag-Sosonko, V. Sl. et Sipaylova 1985 |
| 28J02 | Унiён 1. Agrostion vinealis Sipaylova et al. 1985 |
| | Ас. 1. Koelerietum delavignei Stepanovič 1997 – дэлявінекелерыевая |
| | Ас. 2. Agrostietum vinealis Shelyag-Sosonko et al. 1986 – вінаграднікавамятліцавая |
| | Ас. 3. Hierochloetosum odoratae Stepanovič 2000 – духмяназуброўкавая |
| 29 | **Клас 12. Koelerio-Corynephoretea Klika in Klika et Novák 1941 – супольніцтвы травяных пустак з расходнікамі й галадком** |
| 29C | Ворда 1. Corynephoretalia (canescentis) Klika (1931) 1934 |
| 29C02 | Унiён 1. Corynephorion canescentis Klika 1931 |
| | Ас. 1. Corynephoretum canescentis (Juraszek 1928) Steffen 1931 – булаваносцавая |
| 29D | Ворда 2. Festuco-Sedetalia R. Tx. 1951 |
| 29D01 | Унiён 1. Koelerion glaucae Volk 1931 em. Klika (1935) 1939 |
| | Ас. 1. Koelerietum glaucae Šmarda 1953 em. Stepanovič (1987) 1988 – шызакелерыевая |
| 29D02 | Унiён 2. Plantagini-Festucion ovinae Passarge 1964 |
| | Ас. 1. Calamagrostidetum epigeji (Domin 1929) Klika 1931 – наземнапажарніцавая |
| | Ас. 2. Festucetum ovinae (Suza 1930) Klika 1954 em. Schelyag-Sosonko et al. 1985 – авечамурожніцавая |
| 29F | Ворда 3. Sedo-Scleranthetalia (biennis) Br.-Bl. 1955 |
| 29F01 | Унiён 1. Hyperico perforati-Scleranthion perennis Moravec 1967 |
| | Ас. 1. Helichryso-Jasionetum Libb. 1940 – цмена-букашнікавая |
| 30 | **Клас 13. Calluno-Ulicetea (Quantin 1935) R. Tx. 1937 – верасова-сіўцовыя супольніцтвы на папялістых глебах** |
| 30A | Ворда 1. Nardetalia (strictae) Oberdorfer 1949 em. Preising 1949 |
| 30A03 | Унiён 1. Equiseto-Galion borealis (R. Tx. et Bötscher 1969) |
| | Ас. 1. Galietum boreali (R. Tx. et Bötscher 1969) ass. nova – паўночнамарунавая |
| 30A05 | Унiён 2. Nardo-Agrostion tenuis Sillinger 1933 |
| | Ас. 1. Nardetum strictae (Domin 1923) Knapp 1945 – сіўцовая |
| | Ас. 2. Agrostidetum vulgaris Szafer et al. 1927 em. Hueck 1931 – звычайнамятліцавая |

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

| | |
|---|---|
| 30C | Ворда 2. Vaccinio-Genistetalia Schubert 1960* |
| 30C03 | Уніён 1. Genisto-Vaccinion Br.-Bl. 1926 p. p. |
| | Ас. 1. Callunetum vulgaris Domin (1928) 1929 – верасовая |
| | Ас. 2. Scabioso canescentis-Genistetum tinctoriae Balcerkiewicz et Brzeg 1993 ex Brzeg et M. Wojterńska 2001 – скабіёза-фарбавальнажаўтазелевая |
| | Ас. 3. Sarothamnetum scoparii Susplugas (1935) 1942 – жарнаўцовая |
| | Ас. 4. Vaccinio-Callunetum Bük. 1942 em. Schubert 1960 – бруснічна-верасовая |
| 31 | **Клас 14. Trifolio-Geranietea sanguinei Müller 1961 – ксератэрмныя супольніцтвы узлескаў** |
| 31A | Ворда 1. Melampyro-Holcetalia Passarge 1967 |
| 31A02 | Уніён 1. Melampyrion pratensis Passarge 1967 |
| | Ас. 1. Stachyo-Melampyretum nemorosi Passarge 1967 – чысцікава-дуброўнабратаўкавая |
| 31B | Ворда 2. Origanetalia vulgaris Müller 1961 |
| 31B04 | Уніён 1. Trifolion medii Müller 1961 |
| | Ас. 1. Trifolietum medii Müller 1961 em. Stepanovič (1987) 1991 – сярэднеканюшынавая |
| | Ас. 2. Equisetetum hyemali ass. nova – зімавальнахвашчовая |
| 53 | **Клас 15. Salicetea purpureae Moor 1958 – супольніцтвы прырэчнага вербалозу*** |
| 53A | Ворда 1. Salicetalia purpureae Moor 1958 |
| 53A01 | Уніён 1. Rubo caesii-Amorphion fruticosae Shevehyk et V. Sl. 1996 |
| | Ас. 1. Salicetum acutifoliae Pulgar et al. 1996 – востралістявербавая |
| 53A02 | Уніён 2. Salicion albae Soó 1930 em. R. Tx. 1955 em. Müller et Görs 1958 |
| | Ас. 1. Salicetum triandro-viminalis Lohmeher 1952 – трохтычынкава-кошыкававербавая |
| | Ас. 2. Salicetum purpureae Wendelberger-Zelinka 1952 em. Moor 1958 – пурпуровавербавая |
| | Ас. 3. Salicetum albae Issler 1926 em. Oberdorfer 1953 em. Müller et Görs 1958 – белавербавая |
| | Ас. 4. Salicetum fragilis Passarge 1957 – ломкавербавая |
| 53A06 | Уніён 3. Salicion triandrae Müller et Görs 1958 |
| | Ас. 1. Salicetum triandrae Malcuit 1929 – трохтычынкававербавая |
| | Ас. 2. Salicetum myrsinifoliae (Mazan in Parfenov et Mazan 1986) ass. nova – мірзіналіставербавая |
| 54 | **Клас 16. Populetea albae Br.-Bl. 1962 – шэраальховыя, ясеневыя й таполевыя супольніцтвы*** |
| 54A | Ворда 1. Fraxinetalia Scamoni et Passarge 1959 |
| 54A01 | Уніён 1. Alnion incanae Pawłowski 1928 |
| | Ас. 1. Alnetum incanae Lüdi 1921 em. Aichinger et Siegr. 1930 – шэраальховая |
| | Ас. 2. Urtico dioicae-Fraxinetum excelsiori Oberdorfer 1953 – крапіўна-ясеневая |
| | Ас. 3. Carici remotae-Fraxinetum (excelsiori) Koch 1926 – рассунутаасакова-ясеневая |
| 54B | Ворда 2. Populetalia (albae) Br.-Bl. 1931 em. Br.-Bl. ex Tchou 1948 |
| 54B03 | Уніён 1. Populion albae Br.-Bl. 1931 em. Br.-Bl. ex Tchou 1948 |
| | Ас. 1. Populetum albae Br.-Bl. 1931 – белатаполевая |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| | Ас. 2. Salici (albae)-Populetum nigrae (R. Tx. 1931) Meyer-Drees 1936 – белавербава-чорнатаполевая |
| 55 | **Клас 17. Alnetea glutinosae Br.-Bl. et R. Tx. 1943 em. Müller et Görs 1958 – супольніцтвы чорнаальховых лясоў*** |
| 55A | Ворда 1. Alnetalia glutinosae R. Tx. 1937 em. Müller et Görs 1958 |
| 55A01 | Уніён 1. Alnion glutinosae Malcuit 1929 em. Meijer Drees 1936 |
| | Ас. 1. Urtico-Alnetum glutinosae (Scamoni 1935) Fukarek 1961 – крапіўна-чорнаальховая |
| | Ас. 2. Filipendulo ulmariae-Alnetum glutinosae (Lemée 1937) Rameau 1994 – вязаліставятроўнікава-чорнаальховая |
| | Ас. 3. Ribo nigri-Alnetum (glutinosae) Sol.-Górn. 1975 – чорнапарэчкава-чорнаальховая |
| | Ас. 4. Carici elongatae-Alnetum (glutinosae) Koch 1926 ex R. Tx. 1937 em. Bod. 1955 – падоўжанаасакова-чорнаальховая |
| | Ас. 5. Sphagno-Alnetum glutinosae Lemée 1937 – сфагнава-чорнаальховая |
| | Ас. 6. Hottonio-Alnetum glutinosae Hueck 1929 – вадаперыцава-чорнаальховая |
| | Ас. 7. Alno (glutinosae)-Betuletum (pubescentis) Scamoni 1959 – чорнаальхова-пушыстабярозавая |
| 56 | **Клас 18. Franguletea Doing 1962 – супольніцтвы ацыдафільных балотных хмызнякоў** |
| 56B | Ворда 1. Salicetalia auritae Doing 1962 |
| 56B01 | Уніён 1. Salicion cinereae Müller et Görs ex Passarge 1961 |
| | Ас. 1. Molinio-Salicetum rosmarinifoliae Magyar ex Soó 1933 – малініева-размарыналістavербавая |
| | Ас. 2. Salicetum pentandro-cinereae (Almquist 1929) Passarge 1961 – пяцітычынкава-попелнашэравербавая |
| | Ас. 3. Salicetum auritae Jonas 1935 – вушаставербавая* |
| | Ас. 4. Betuletum humilis Fijałkowski 1959 – прысадзістабярозавая |
| 58 | **Клас 19. Rhamno-Prunetea Br.-Bl. et R. Tx. 1943 em. Müller et Görs 1958 – супольніцтвы ксератэрмных хмызнякоў*** |
| 58A | Ворда 1. Prunetalia spinosae R. Tx. 1952 |
| 58A04 | Уніён 1. Carpino-Prunion (R. Tx. 1952) Weber 1974 |
| | Ас. 1. Carpino-Prunetum (spinosae) R. Tx. 1952 – грабава-цярновая |
| | Ас. 2. Rubo-Coryletum (avellanae) Oberdorfer 1957 – ажынава-арэшнікавая |
| 59 | **Клас 20. Querco-Fagetea (silvaticae) Br.-Bl. et Vlieger 1937 em. Klika 1939 – супольніцтвы шыракалістых і асінавых лясоў*** |
| 59A | Ворда 1. Betulo pendulae-Populetalia tremulae Rivas-Martínez et Costa 2002 |
| 59A03 | Уніён 1. Corylo-Populion tremulae Br.-Bl. 1961 em. Rivas-Martínez et Costa 1998 |
| | Ас. 1. Rubo saxatilis-Populetum tremulae Korotkov 1986 – касцяніцава-асінавая |
| 59B | Ворда 1. Fagetalia silvaticae Pawłowski in Pawł., Sokoł., Wallisch 1928 |
| 59B04 | Уніён 1. Carpinion betuli Issler 1931 em. Mayer 1937 em. Oberdorfer 1953 |
| | Ас. 1. Tilio (cordatae)-Caprinetum (betuli) Traczyk 1962 – ліпава-грабавая |
| | Ас. 2. Querco (robori)-Carpinetum (betuli) Scamoni 1963 – дубова-грабавая |
| | Ас. 3. Oxalido-Carpinetum betuli ass. nova – кісліцава-грабавая |
| 59B18 | Уніён 2. Tilio platyphyllis-Acerion pseudoplatani Klika 1955 |
| | Ас. 1. Aceri (platanoides)-Tilietum (cordatae) Faber 1936 – клянова-ліпавая |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| 61 | **Клас 21. Quercetea roboris Br.-Bl. et Vlieger 1937 em. Klika 1939 – супольніцтвы дуброў*** |
| 61B | Ворда 1. Quercetalia roboris R. Tx. 1931 ex R. Tx. 1937 em. Rivas-Martínez 1973 |
| 61B03 | Уніён 1. Convallario majalis-Quercion roboris (Quercion roboris-petraeae Br.-Bl. 1931) |
| | Ас. 1. Agrostio (vulgaris)-Quercetum (roboris) Passarge 1953 – звычайнамятліцава-дубовая |
| | Ас. 2. Convallario majali-Quercetum robori Shevehyk et V. Sl. in Shevehyk et al. 1996 – ландышава-дубовая |
| 61B04 | Уніён 2. Dicrano-Quercion (Quercion roboris Malcuit 1929) |
| | Ас. 1. Trollio europaei-Quercetum roboris Korotkov 1986 – пярэснава-дубовая |
| | Ас. 2. Carici digitatae-Quercetum roboris ass. nova – пальчатаасакова-дубовая |
| 61B09 | Уніён 4. Quercion roboris Malcuit 1929 |
| | Ас. 1. Pteridio aquilini-Quercetum robori Bajrak 1996 – арлякова-дубовая |
| | Ас. 2. Vaccinio myrtilli-Quercetum roboris P. Silva et al. 1950 – чарнічна-дубовая |
| | Ас. 3. Oxalido-Quercetum roboris ass. nova – кісліцава-дубовая |
| | Ас. 4. Dryopterido-Quercetum roboris ass. nova – папарацева-дубовая |
| 64 | **Клас 22. Pyrolo-Pinetea Korneck in Oberd. et al. p. p. – супольніцтвы барэальных хваёвых лясоў*** |
| 64B | Ворда 1. Festuco-Pinetalia sylvestris Oberdorfer 1949 |
| 64B01 | Уніён 1. Cytiso ruthenici-Pinion (sylvestris) Krausch 1962 |
| | Ас. 1. Corynephoro-Pinetum sylvestris (Juraszek 1928) Hofmann 1964 – булаваносцава-хваёвая |
| | Ас. 2. Koelerio glaucae-Pinetum sylvestris (Steffen 1931) Krausch 1962 – шызакелерыева-хваёвая |
| | Ас. 3. Pino sylvestris-Juniperetum communis ass. nova – хваёва-ядлоўцавая |
| | Ас. 4. Pyrolo-Pinetum (sylvestris) (Libbert 1933) E. Schmidt 1936 – ігрушанкава-хваёвая |
| | Ас. 5. Cladonio-Pinetum (sylvestris) Juraszek 1927 – кладоніева-хваёвая |
| 64B02 | Уніён 2. Festuco vaginatae-Pinion (sylvestris) Soó 1971 |
| | Ас. 1. Peucedano-Pinetum (sylvestris) J. Matuszkiewicz (1962) 1973 – горнапятрушкава- хваёвая |
| | Ас. 2. Convallario-Pinetum sylvestris ass. nova – ландышава-хваёвая |
| | Ас. 3. Pleurozio schreberi-Pinetum (sylvestris) cult. Šomšáková 1988 – плеўрозіева-хваёвая |
| | Ас. 4. Vaccinio vitis-idaeae - Pinetum (sylvestris) Sokoɫowski 1980 – бруснічна-хваёвая |
| 66 | **Клас 23. Vaccinio-Piceetea (abietis) Br.-Bl. in Br.-Bl., Sissingh et Vlieger 1939 – супольніцтвы барэальных пераважна яловых лясоў*** |
| 66C | Ворда 1. Piceetalia excelsae Pawłowski in Pawł. et al. 1928 |
| 66C01 | Уніён 1. Dicrano-Pinion (silvestris) (Libbert 1933) Wɫ. Matuszkiewicz 1962 em Oberdorfer 1979 |
| | Ас. 1. Pteridio-Pinetum (sylvestris) Andrienko 1986 – арлякова-хваёвая |
| | Ас. 2. Serratulo-Pinetum (sylvestris) J. Matuszkiewicz 1981 – сярпухава-хваёвая |
| | Ас. 3. Querco roboris-Pinetum (sylvestris) J. Matuszkiewicz 1981 – дубова-хваёвая |
| | Ас. 4. Betuletum pendulae (Baliavičenė 1988) – барадаўчатабярозавая |
| | Ас. 5. Pineto (sylvestris)-Vaccinietum myrtilli (Kobendza 1930) Br.-Bl. et Vlieger 1939 – хваёва-чарнічная |

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ

| | |
|---|---|
| | Ас. 6. Leucobryo (glauci)-Pinetum (sylvestris) Wł. Matuszkiewicz (1962) 1973 – леўкабрыева-хваёвая |
| | Ас. 7. Molinio (coeruleae)-Pinetum (sylvestris) (J. Matuszkiewicz 1973) Matuszkiewicz 1984 – малініева-хваёвая |
| 66С02 | Уніён 2. Piceion excelsae Pawłowski in Pawł. et al. 1928 |
| | Ас. 1. Querco (robori)-Piceetum (abies) Wł. Matuszkiewicz 1952 em. Matuszkiewicz et Pol. 1955 – дубова-яловая |
| | Ас. 2. Eu-Piceetum (abies) Caj. 1921 em. K. Lund 1967 – яловая |
| | Ас. 3. Betulo pubescentis-Piceetum (abies) Sokołowski 1980 – пушыстабярозава-яловая |
| | Ас. 4. Vaccinio uliginosi-Pinetum sylvestris (Hueck. 1925) Kleist 1929 – буякова-хваёвая |
| 67 | **Клас 24. Stellarietea mediae (Br.-Bl. 1931) R. Tx., Lohmeyer, Preising 1950 – ворыўныя супольніцтвы малагадовых пустазельных траў*** |
| 67А | Ворда 1. Atriplici-Chenopodietalia albi (R. Tx. 1937) Nordhagen 1940 |
| 67А06 | Уніён 1. Scleranthion annuae (Kruseman et Vlieger 1939) Vlieger 1946 |
| | Ас. 1. Scleranthetum annui (Soó 1961) Gamar et al. 1985 – аднагадовагаладковая |
| | Ас. 2. Galeopsio tetrahit-Sperguletum arvensis Passarge in Pass. et Jurko 1975 – звычайназяберава-полесвінакропавая |
| 67В | Ворда 2. Centauretalia cyani R. Tx. (1943) 1950 |
| 67В06 | Уніён 1. Papaverion rhoeadis V. Sl. 1987 |
| | Ас. 1. Centaureo-Aperetum spicae-venti V. Sl. (1987) 1989 – сіневалошкава-метліцавая |
| | Ас. 2. Vicietum angustifoliae-hirsutae Nowiński 1964 – вузкаліставалосістагарошкавая |
| 67D | Ворда 3. Eragrostietalia J. Tx. 1961 |
| 67D01 | Уніён 1. Amarantho-Chenopodion (rubri) (J. Tx. 1960) (Amarantho blitoidi-Echinochloion crusgalli V. Sl. 1988) |
| | Ас. 1. Galeopsidetum speciosae Krusem et Vlieger 1939 – фарбавальназяберавая |
| 67D05 | Уніён 2. Matricario chamomillae-Chenopodion albi (Panico-Setarion Sissingh 1946) |
| | Ас. 1. Matricarietum perforatae Kepczyńska 1975 – прадзіраўленарамонкавая |
| | Ас. 2. Chenopodietum albi-viride (Br.-Bl. 1921) Hejný 1979 – бела-зялёналебядовая |
| | Ас. 3. Setario-Galinsogetum R. Tx. 1950 – мяшэева-галінзогавая |
| | Ас. 4. Malvetum pusillae Morariu 1943 – маленькамальвавая |
| 67Е | Ворда 4. Sisymbrietalia J. Tx. 1961 |
| 67Е05 | Уніён 1. Sisymbrion officinalis R. Tx., Lohmeyer, Preising in R. Tx. 1950 em. Hejný et al. 1979 |
| | Ас. 1. Sisymbrietum loeselii Gutte (1969) 1972 – лёзэлегуляўнікавая |
| | Ас. 2. Stellarietum mediae Hadač 1969 – сярэднезоркаўкавая |
| | Ас. 3. Polygonetum lapathifolii (Felfoldy 1943) Soó 1961 – разгалістадрасёнавая |
| 68 | **Клас 25. Polygono-Poetea annuae Rivas-Martinez 1975 – прыдарожныя супольніцтвы, падвергнутыя вытаптаванню** |
| 68А | Ворда 1. Polygono arenastri-Poetalia annuae R. Tx. in Géhu, Richard et R. Tx. 1972 |
| 68А01 | Уніён 1. Matricario-Polygonion avicularis Rivas-Martinez 1975 |
| | Ас. 1. Poetum annuae Gams 1927 em. Knapp 1948 – аднагадоваметлюжковая |
| | Ас. 2. Polygonetum avicularis Gams 1927 em. Knapp 1945 em. Jehlik in Hejný et al. 1979 – птушынадрасёнавая |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| | Ас. 3. Lolio (perennis)-Plantaginetum majoris Beger 1930 – пашаварайграсава-вялікатрыпутнікавая |
| | Ас. 4. Polygono-Matricarietum matricarioidis (Sissingh 1969) R. Tx. R. Tx. in Géhu, Richard et R. Tx. 1972 – птушынадрасёнава-пахучарамонкавая |
| | Ас. 5. Potentilletum anserinae Rapaics 1927 em. Passarge 1964 – гусінадуброўкавая |
| 69 | **Клас 26. Artemisietea vulgaris Lohmeyer, Preising et R. Tx. in R. Tx. 1950 em. Kopecký in Hejný et al. 1979 – травяныя супольніцтвы аблогаў і парушаных земляў** |
| 69B | Ворда 1. Agropyretalia repentis Oberdorfer et al. 1967 |
| 69B04 | Уніён 1. Convolvulo arvensis-Agropyrion repentis Görs 1966 |
| | Ас. 1. Artemisietum absinthii Schubert et Mahn. 1959 ex Elias 1982 – горкапалыновая |
| | Ас. 2. Convolvulo arvensis-Agropyretum repentis Felföldy 1943 – полебярозкава-паўзучапырнікавая |
| | Ас. 3. Lupinetum polyphylli Stepanovič (1987) 2000 – шматлісталубінавая |
| | Ас. 4. Cirsietum arvensi-lanceolati Mititelu 1972 – поле-звычайнабадзяковая |
| | Ас. 5. Sonchetum arvensis (Passarge in Pass. et Jurko 1975) Jarolímek et al. 1997 – полеасотавая |
| 69D | Ворда 2. Onopordetalia acanthii Br.-Bl. et R. Tx. 1943 |
| 69D01 | Уніён 1. Arction (lappae) (Tx. 1937) Sissingh 1946 em. Gutte 1972 |
| | Ас. 1. Artemisietum vulgaris R. Tx. 1942 em. Knapp 1945 em. Tobĕrná 1969 – звычайнапалыновая |
| | Ас. 2. Arctietum lappae Felföldy 1942 – вялікалопухавая |
| | Ас. 3. Heracleetum sosnowskyi Stepanovič 2000 – сасноўскабаршчэўнікавая |
| 69D04 | Уніён 2. Dauco-Melilotion Görs 1966 em. Elias 1980 |
| | Ас. 1. Echio-Melilotetum albi R. Tx. (1942) 1947 – сінякова-белабаркуновая |
| | Ас. 2. Melilotetum officinalis (Sissingh 1950) – лекавабаркуновая |
| | Ас. 3. Artemisio-Tanacetetum vulgari Br.-Bl. 1931 em. Stepanovič 2000 – палынова-піжмавая |
| 70 | **Клас 27. Galio-Urticetea Passarge ex Kopecký 1969 em. Müller in Oberdorfer 1983 – супольніцтвы засмечаных земляў** |
| 70B | Ворда 1. Convolvuletalia sepii R. Tx. 1950 |
| 70B02 | Уніён 1. Cynancho-Convolvulion sepium Rivas Goday et Rivas-Martínez 1963 |
| | Ас. 1. Calystegietum sepii (Hilbig 1972) Stepią 1984 – плотавапавітухавая |
| 70D | Ворда 2. Lamio albi-Chenopodietalia boni-henrici Kopecký 1969 |
| 70B02 | Уніён 1. Aegopodion podagrariae R. Tx. 1967 em. Neuhäuslová-Novotná, Neuhäusl et Hejný 1969 |
| | Ас. 1. Anthriscetum sylvestris Hadač 1978 – лесамаркоўнікавая |
| | Ас. 2. Petasitetum spurii Passarge 1964 – несапраўднабелакапытнікавая |
| 70D05 | Уніён 2. Carduo-Urticion dioicae Hadač 1962 |
| | Ас. 1. Urticetum dioicae (Domin 1944) Šmarda et al. 1963 – двухдомнакрапіўная |
| 71 | **Клас 28. Epilobietea angustifolii R. Tx. et Prsg. in R. Tx. 1950 – супольніцтвы лясных высечак і гараў*** |
| 71A | Ворда 1. Atropetalia Vlieger 1937 |
| 71A03 | Уніён 1. Carici piluliferae-Epilobion angustifolii Rübel 1933 |
| | Ас. 1. Epilobietum angustifolii Soó 1934 em. Šmarda 1963 – вузкалістакіпрэевая |
| | Ас. 2. Rubetum idaei Klika 1955 em. Hadač et Smola 1962 – малінавая |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | |
|---|---|
| | Ас. 3. Rubetum caesius Klika 1955 – ажынавая |
| | Ас. 4. Valeriano-Fragarietum vescae O. Bolòs 1977 – валяр'янава-лесасунічная |
| 72 | **Клас 29. Bidentetea tripartiti R. Tx., Lohmeyer et Preising in R. Tx. 1950 – супольніцтвы на багатых ілістых мокрых глебах** |
| 72A | Ворда 1. Bidentetalia tripartiti Br.-Bl. et R. Tx. 1943 |
| 72A01 | Уніён 1. Bidention tripartiti Nordhagen (1939) 1940 |
| | Ас. 1. Bidentetum tripartiti Koch 1926 em. Libbert 1932 – трохпадзельнаваўчковая |
| | Ас. 2. Myosuretum minimi (Diemont et al. 1940) R. Tx. 1950 – мышахвоснікавая |
| 72A02 | Уніён 2. Chenopodion rubri J. Tx. in Poli et J. Tx. 1960 corr. Kopecký 1969* |
| | Ас. 1. Chenopodietum rubri Timar 1950 – чырваналебядовая |

Заўвагі: 1 – супольніцтвы, пералік якіх папярэдні, пазначаны *;
2 – з улікам адсутнасці дакладных літаратурных звестак назовы некаторых супольніцтваў дадзены без аўтарства.

**Вынікі й іх абмеркаванне.** Згодна з прадромусам (гл. табл. 2) біяразнастайнасць расліннасці Беларусі прадстаўлена 232 асацыяцыямі супольніцтваў, аднесеных да 78 уніёнаў (саюзаў), 49 вордаў (парадкаў) і 29 класаў. Сярод прыроднай расліннасці па колькасці асноўных адзінак (асацыяцый) першынствуюць класы *Molinio-Arrhenatheretea* – супольніцтвы сапраўдных (эўмезафільных) і сырых лугоў (34 асацыяцыі) і *Phragmito-Magnocaricetea* – балоцістыя травяныя супольніцтвы (26 асацыяцый). За імі крочаць класы *Potametea* – супольніцтвы прэснаводных вадаёмаў (16 асацыяцый); *Scheuchzerio-Caricetea fuscae* – ацыдафільныя супольніцтвы травяных балот (12 асацыяцый); *Vaccinio-Piceetea* – супольніцтвы барэальных пераважна яловых лясоў (11 асацыяцый), куды ўваходзяць мезафільныя хвойнікі й бярэзнікі; *Pyrolo-Pinetea* – супольніцтвы барэальных хваёвых лясоў (9 асацыяцый).

Супольніцтвы большыні класаў распаўсюджаны нязначна па плошчы й радзей: *Quercetea roboris* – супольніцтвы дуброў (8 асацыяцый); *Calluno-Ulicetea* – верасова-сіўцовыя супольніцтвы на папялістых глебах (7 асацыяцый); *Alnetea glutinosae* – супольніцтвы чорнаальховых лясоў (7 асацыяцый); *Salicetea purpureae* – супольніцтвы прырэчнага й прыдарожнага вербалозу (7 асацыяцый); *Festuco-Brometea* – астэпаваныя (ксератэрмныя) лугавыя супольніцтвы (7 асацыяцый); *Lemnetea* – супольніцтвы плавальных раслін (6 асацыяцый); *Oxycocco-Sphagnetea* – супольніцтвы вярховых і пераходных балот (6 асацыяцый); *Koelerio-Corynephoretea* – супольніцтвы травяных пустак з расходнікамі й галадком (5 асацыяцый); *Populetea albae* – шэраальховыя, ясеневыя й таполевыя супольніцтвы (5 асацыяцый); *Querco-Fagetea* – супольніцтвы шыракалістых і асінавых лясоў (5 асацыяцый); *Festuco-Puccinellietea* – травяныя супольніцтвы на багатых працягла заліўных алювіяльных глебах (5 асацыяцый); *Franguletea* – супольніцтвы ацыдафільных балотных хмызнякоў (4 асацыяцыі); *Isoëto-Littorelletea* – супольніцтвы водмеляў (4 асацыяцыі). Адзінкавымі фітацэнозамі прадстаўлены класы *Honkenyo-Elymetea arenarii* – прыбярэжныя атлантычныя травяныя супольніцтвы (1 асацыяцыя); *Rhamno-Prunetea* –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

супольніцтвы ксератэрмных хмызнякоў (2 асацыяцыі); *Montio-Cardaminetea* – крынічныя супольніцтвы (3 асацыяцыі), *Trifolio-Geranietea sanguinei* – ксератэрмныя супольніцтвы ўзлескаў (3 асацыяцыі) (гл. табл. 2). Цярновыя супольніцтвы класа *Rhamno-Prunetea* й пясчанакаласняковыя класа *Honkenyo-Elymetea arenarii* – вельмі рэдкія для Беларусі, якія маюць месца толькі ў басейне р. Буг.

На ўзроўні асацыяцый рэдкімі для Беларусі й Еўропы з'яўляюцца супольніцтвы шэрагу травяных: *Beckmannietum eruciformis, Caricetum echinatae, Caricetum juncellae, Eleocharidetum uniglumis, Festucetum polesicae, Hierochloetum odoratae, Juncetum atrati* й інш., – прапанаваных у якасці матэрыялу да будучай Зялёнай кнігі краіны [10].

Такая канцэнтраваная, у чымсьці асаблівая біяразнастайнасць расліннага покрыва абумоўлена становішчам нашай краіны ў геаграфічным цэнтры еўрапейскага кантынента, дзе адбываецца актыўнае ўзаемапранікненне немаральнай і барэальнай расліннасцяў [11].

**Заключэнне.** Прыведзеная вышэй фітацэнатычная раскладка добра карэлюе з глебава-гідралагічнымі, араграфічнымі й занальна-геабатанічнымі умовамі краіны. Так, агульнае адрозненне паўночнай геабатанічнай падзоны – панаванне супольніцтваў барэальных пераважна яловых лясоў, супольніцтваў вярховых балот, прэснаводных вадаёмаў і сухадольных лугоў. Для паўднёвай падзоны характэрны супольніцтвы нізінных балот, поплаўных лугоў, барэальных хваёвых і шыракалістых лясоў. У цэнтральнай падзоне назіраецца спалучэнне хваёвых і яловых лясоў, сухадольных і поплаўных лугоў, перавага пераходных балот.

Трэба адзначыць, што ў сувязі з развіццём урбанізацыі, прамысловага, дарожнага й меліярацыйнага будаўніцтва адбылося рэзкае скарачэнне плошчаў, занятых прыроднай расліннасцю. За апошняе стагоддзе з тэрыторыі краіны знікла блізу 70 абарыгенных відаў раслін. Да катэгорыі знікальных аднесена 59 відаў [12]. Знікаюць цэлыя раслінныя супольніцтвы й экасістэмы, як напрыклад, травяныя нізінныя балоты. Спыніць гэты працэс можна толькі шляхам мэтанакіраванага рэгулявання ўсёй гаспадарчай дзейнасці ў краіне з улікам біялагічнай і экалагічнай разнастайнасці навакольнага асяроддзя. Сістэма фітасупольніцтваў і экатопаў – першааснова, на якой павінна грунтавацца ахова й рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў.

**Літаратура**

1. Конвенция о биологическом разнообразии. Рио-де-Жанейро, 5 июля 1992 года / Программа Организации Объединенных Наций по окружающей среде. Мн., 1993. 32 с.

2. Скарбы прыроды Беларусі: Тэрыторыі, якія маюць міжнароднае значэнне для захавання біялагічнай разнастайнасці. – Treasures of Belarusian Nature: Areas of International Significance for Conservation of Biological Diversity / Пад агульнай рэд. А. В. Казуліна. Мн.: Беларусь, 2002. 160 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

3. Ключевые ботанические территории Беларуси / Масловский О. М., Пронькина Г. А., Парфенов В. И., Пугачевский А. В., Третьяков Д. И., Степанович И. М. и др.; под ред.О. М. Масловского, Г. А. Пронькиной. М.–Мн.: Бестиор, 2005. 80 с.
4. Rodwell J. S., Schaminée J. H. J., Mucina L., Pignatti S., Dring J., Moss D. The Diversity of European Vegetation. An overview of phytosociological alliances and their relationships to EUNIS habitats. Wageningen: The Netherlands, 2002. 167 p.
5. Сцепановіч І. М. Эколага-фларыстычны дыягназ сінтаксонаў прыроднай травяністай раслiннасцi Беларусi. Мн.: “Камтат”, 2000. 140 с.
6. Сцепановіч І. М. // Весці АН Беларусі. Сер. біял. навук. № 2, 1994. С. 18–22
7. Сцепановіч І. М. Сінтаксанамія і сіндынаміка лугавой расліннасці Беларусі: Дыс. ...докт. біял. навук. Мінск, 1999. 775 с.
8. Сцепановіч Я. М. // Ботаника: Исследования. Вып. 33. Мн.: Право и экономика, 2005. С. 69–76
9. Сцепановіч Я. М. Трансект-метад як аснова маніторынгу раслінных экасістэм (з нямецкага досведу) // Міжнародны экалагічны досвед і яго выкарыстанне на Беларусі. Зборнік навуковых артыкулаў. International Environmental Experience: Applications for Belarus (collected papers) / Пад агульнай рэд. У. К. Слабіна. – Віцебск: ВФ УА ІСВ, 2003. С. 226–230
10. Сцепановіч Я. М. // Природные ресурсы, № 3, 2000. С. 16–27
11. Гельтман В. С. Географический и типологический анализ лесной растительности Белоруссии. Мн.: Наука и техника, 1982. 326 с.
12. Состояние и использование биологического разнообразия Республики Беларусь (Аналитический обзор) / Коорд. и научн. ред. Никифоров М. Е. Мн.: Центр “Конкордия”, 1998. 111 с.

**Summary**

In view of the previous operating time and the analysis of the new geobotanical data collected by the author (in common more than 5 thousand descriptions) is made the prodromus of the highest syntaxonomic units of vegetation of Belarus, numbering 29 classes, 49 orders, 78 unions and 232 associations. Thus such integrated parameter of phytocommunities, as edificator dominants is used.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ